№ 50 Ausgabe B.

ГОМАН

Беларуская Віленская часопіс
выходзіць два разы у тыдзень: у аўторкі і пятніцы.

Адрэс рэдакцыі: Вільня, Віленская 33.
Адрэс адміністрацыі і экспэдыцыі: М. Стэфанская 23.

Цэна с перасылкай і дастаукай да хаты: на 1 год—4 м. 80 фэн., на ½ году—2 м. 40 ф., на 3 месяцы—1 м. 20 ф., на 1 мес.—40 фэн.

Цэна абвестак: на 4-ай старане за радок дробнымі літэрамі — 25 фэніг.; дробные абвесткі—па 5 фэн за слова. Абвесткі аб сьмерці — 60 фэн. за лінейку дробн. друкам

№ 50 (246). Год III. Вільня, 21 чэрвеня 1918 г. Цэна 5 фэн. (3 кап.)

ТЭЛЕГРАМЫ.

20 чэрвеня.

Заходні тэатр:

Фронт Рупрэхта Баварскага: Жывейшая чыннасць ворагаў. Іх наступленьні на розных пунктах фронту адбіты.

Фронт нямецкага Насьледніка: Новые наступленьні ворагаў пры Шато Т'ері зламаліся пад нашым агнём.

Фронт Гальвіца: Між Маасам і Мозэлем нашы дружыны глыбока ўварваліся на амэрыканскіе пазыцыі і зрабілі у ворагаў цяжкіе страты.

Капітан Бэртольд дайшоў свае 36-е пабеды на паветры.

БЭРЛІН. На скаргі аўстрыяцкіх газэт, што паменшэньне порцый хлеба ў Аўстрыі вызвано неспаўненьнем узятага на сябе Нямеччынай абавязку дастаўкі хлеба, урадовая «Nordd. Allg. Ztg.» адказывае, што нямецкі ўрад узяўся даставіць Айстрыі хлеб не з нямецкіх запасаў, а з Украіны, Бэсарабіі і Румыніі. Нямеччына са свайго боку зрабіла ўсё магчымае дзеля аблягчэньня пракармленьня Аўстрыі.

КЭЛЬН. Б. канцлер, Бэтманн-Гольвэг, цяжка занядужаў. Паляруш яшчэ пагоршыў яго палажэньне.

БЭРЛІН. Францускі ўрад дагэтуль трусьліва стараўся укрываць праўду аб францускіх стратах у гэтай вайне. Цяпер францускі генэральны паўнамочнік у Амэрыцэ, Тард'е, у сваіх агітацыйных прамовах прыадкрыў завесу над гэтым. Ен даў гэткіе данные:

„На незанятай немцамі францускай зямлі жывуць 35 мільёнаў душ. За час вайны у армію паступіло $7\frac{1}{2}$ мільёнаў і $1\frac{1}{2}$ мільёна робілі ў ваенных фабрыках. Страты даходзяць 2 мільёнаў 600 тысяч душ. У тым ліку 1 мільён 300 тысяч забітых".

ПАРЫЖ (Гавас). Дэкрэтам ураду пры міністру-прэзыдэнце арганізуецца француска-амэрыканскі сэкрэтарыат, задача каторага — дайсьці цясьнейшае еднасьці Амэрыкі і Францыі ў вядзеньні вайны і ў палітыцэ ў адносінах да нэутральных краёў. За генэральнага камісара назначаецца Тард'е, каторы дзеля гэткае-ж мэты знаходзіцца цяпер у Амэрыцэ.

ЖЭНЕВА. Стычкі ў Марокко між тамтэйшымі плямёнамі і французамі не спыняюцца. Францускіе лятуны за кару за напасьці робяць налёты на вёскі месцовых жыхараў.

БЭРЛІН. Газэта судаходства „Journal of Commerce" у Лівэрпулі пішэ с прычыны чысьленых заяў англіцкіх міністраў, што небаспекі ад падводнае вайны больш німа:

«Англіцкі народ лішне доўга пазваляў сваім міністрам закрываць яму вочы ад страшэннай небаспекі, якая яго жджэ. Калі-б падводная вайна папраўдзі не была болей страшна для нас, дык мы не перэжывалі-бы гэткага вострага крызыса судаходства. Апавешчэные цыфры аб затопленых і будаваных новых караблёх зусім не апраўдываюць оптымізму Ллойда Джорджа. Трэба толькі дзівавацца, з якой деніальнай лёгкасьцю прыкрываецца пропасьць між фактамі і абецанкамі».

ГААГА. У англіцкай ніжняй палапе пасьля прамовы Бонар Лоў выступіў Асквіт, каторы дамагаўся пэрыодычных справаздач ураду на тайных заседаньнях. Палажэньне на фронці незвычайна сурёзнае. У адносінах да Расеі патрэбна чынная палітыка саюзьнікаў. Іх дыплёматыя павіна ўсемі сіламі дабівацца павароту зносін, дружбы і даверыя Расеі.

ЖЭНЕВА. Доказ недаверыя французаў да англічан даюць энэргічные пратэсты англіцкага пасла проці вестак францускіх газэт, бытцым Англія бярэ назад часьць свае арміі. У Лёндоне ёсць толькі салдаты, пушчэные на пабыўку. Па ўсей Англіі і Ірляндыі ёсьць толькі канечне патрэбнае числo войск. Казка, бытцым у Англіі ёсьць мільённае войска, вельмі небаспечна для палітычнага настраеньня.

ГААГА. Амэрыканскае марское міністэрства мае доказы, што ў канцы 1917 году ў Ціхім акіане былі два малые нямецкіе памочные крэйсэры. Адзін з іх нават напаў на параход, на каторым першы міністэр Аўстраліі ехаў ў Амэрыку.

ГААГА. Вільсон прыняў дэпутацыю саюза жаноцкага раўнапраўства і абецаўся падаць у конвэнт праект аб выбарных правох жанок.

ГААГА. Галава соцыалістаў, Трэльстра, выехаў у Гавр дзеля нарады з Вандэрвэльдэ. Англіцкі пасол заявіў яму, што анліцкі ўрад не дае яму пазваленьня на прыезд у Англію.

РЫМ. У палаце дэпутатаў ад імі 70 дэпутатаў пададзена рэзалюцыя з жаданьнем энэргічнага вядзеньня вайны.

РЫМ. Першая група амэрыканскіх лятуноў выехала з Рыму на італьянскі фронт.

БЭРЛІН. **Урадова**. У паўночных водах падводные лодкі затапілі 13.000 тонн.

БЭРЛІН. Між амэрыканскім паслом у Японіі і Японскім урадам зроблена ўмова, паводлуг каторае Японія дае Амэрыцэ 66 параходаў ёмкасьцю разам на 544 тыс. тонн дзеля плаваньня ў Атлянтыцкім акіпне.

Вільня, 21 чэрвеня 1918.

Палажэньне тых малых народаў, каторые ў гэтай вайне апынуліся бытцым між молатам і кавадлам—паміж ваюючымі вялікімі дзержавамі, вельмі незавіднае. Тые спаміж іх, каторые, маючы сваю аружную сілу, прабавалі прыняць чыннае учасьце ў барацьбе эуропэйскіх волатаў, былі зразу разгромлены (Бэльгія, Сэрбія, Чорнагорыя); а хто ня меў ні сілы, ні ахвоты бароцца за чужые інтарэсы, дык і той не абмінуў падобнае долі: іх зьнішчылі ведзеные на іх землях бітвы, пераходы войск, сыстэма адступаючых армій нішчыць за сабой усё дабро, каб не папало ў рукі ворагаў.

Да апошняе групы належыць і наш край. Яго сыны пад прынукай ішлі ў расейскую армію—у армію дзержавы, каторая больш за сотню гадоў няволіла іх Бацькаўшчыну. І праліваньне беларускае крыві за чужую для нас справу — гэта найвялікшая трагэдыя нашага многапакутнага народу. А ўсё ж такі Беларусь, як асобны край, сьмела можэ сказаць, што яна у сьвядомасьці свaей была ў гэтай вайне зусім нэутральнай.

Чым бліжэй да канца вайны, тым вастрэй выступае пытаньне аб далейшай долі зьнішчэных у часе вайны старонак. Тые, што прынімалі чыннае ўчасьце ў вайне, ускладаюць надзею на сваіх саюзьнікаў, веручы, што пры падпісаньні агульнага міра іх гасударственая незалежнасьць будзе адбудована. А што жджэ нас, што жджэ нам падобных?

Сусьветны мір — гэта паварот раўнавагі ў міжнародным палітычным жыцьці. Мір можэ быць папраўдзі трывалым толькі тады, калі ваюючые дзержавы перэканаюцца, што аружжэм яны адна аднэй не здалеюць зьнішчыць. Але падобна таму, як, важучы штось на вазе, адна лішняя крупінка на чашцы вагі перэцягівае ўсю другую, так і ў палітычнай раўнавазе вялікіх дзержаў якісь маленькі край можэ адыграць ролю тае перэважываючай крупінкі. Вось чаму мы верым, што эуропейская дыплёматыя ня можэ прайсьці моўчкі міма такіх фактаў, як абвешчэньне незалежнасьці Беларусі, бо выявіўшыйся тут палітычны ідэал дзесяцімільённага народу ў будучыне можэ заўсёды рабіць многа клапотаў тэй дзержаве, каторая захацела-бы закаваць Беларусь у новые путы няволі.

Ясна, што прызнаньне незалежнасьці Беларусі будзе залежаць ад агульнага укладу палітычных адносін у Эўропе—асабліва адносін у ўсходняй часьці Эўропы. Але, каб наш край папраўдзі мог адыграць ролю „перэважываючай крупінкі", гэта залежыць і ад нас самых: бо дзеля гэтага мы павінны мець сваю—хоць мо' й невялікую, ды ясную, пэўную вагу. А такую вагу мецімем тады, калі ўсе нашы сілы аддамо на паглыбленьне нацыональнае сьвядомасьці ў нашым народзі, калі будзем разьвіваць яго творчые сілы, ладзючы шырокую сець нацыанальных школ усіх тыпаў, адкрываючы ўсім доступ да іх, разьвіваючы наш край экономічна і арганізуючы на нацыанальным грунці народные масы. І калі аб нашай долі будуць судзіць нашы вялікіе суседзі без нас, дык усё-ж яны будуць прымушэны з намі лічыцца.

Антысэмітызм у Польшчы.

Паводлуг ведамасьцей «Jüdische Rundschau», у Варшаве і Лодзі ў апошніх часах на ўсіх крыжавінах вуліц расклеівалі праклямацыі с прызывам да жыдоўскіх пагромаў. Між іншым, тамака было напісано:

„Жыдоўскіе банды рабуюць Польшчу. Жыды вызываюць між намі нязгоду і грамадзкую вайну. Трэба палажыць канец жыдоўскім інтрыгам. За сваю ганебную палітыку жыды будуць пакараны. Трэба зьнішчыць гэту банду. Гэтым жыдом трэба даць навуку".

Урадовые ўласьці гэтых праклямацый зусім ня нішчылі. На запытаньне міліцыянты адказвалі, што ім гэтага не загадывалі. А ў той жэ час жыдоўскім газэтам польскіе ўласьці забаранілі штоколечы пісаць аб гэтых праклямацыях. Жыдоўскае насяленьне вельмі устрывожэно, баяцца жыдоўскага пагрому.

Што гэная праклямацыя—плод палітычнай афэры, відаць с таго, што творыцца ў Галічыне. 4 чэрвеня у Львове былі разасланы жыхарам лісткі с пытаньнямі аб нацыанальнасьці; пры гэтым было заяўлено, што на пытаньне, якім языком хто гаворыць, ні ў якім здарэньні нельга пісаць, што па жыдоўску. Пратэстаў проці гэтага не дапускалі. Мэта гэтага — зусім ясная: жыдоў хочуць прымусіць запісывацца палякамі. У Польшчы, відаць, вядзецца такая-ж палітыка: жыдоў пужаючы хочуць давясьці да таго, каб яны прызнавалі сябе за палякоў жыдоўскае веры".

Каля зямельнай справы.

Статыстыка—гэта мёртвы язык, калі мы не зьвязываем цыфр з агульнымі варункамі жыцьця. Толькі разгледзіўшы акуратна, скуль, як і чаму атрымліваем мы тые або іншые статыстычные данные, можэм зразумець іх значэньне ў поўнай меры.

Зьвертаючыся да нашых зямельных адносін на абшары Беларуска-Літоўскага краю, мы можэм зрабіць дужа цікавые вывады аб агульным кірунку разьвіцьця тут зямельнай справы, стаўляючы побач данные: 1) аб узросьці агуль-

нага числа жыхараў паадзінокіх губэрняў; 2) аб узросьці спэцыяльна селянскага насяленьня і 3) аб разьмерах прыкупленай селянамі зямлі.

Прырост сельскага насяленьня за 10 гадоў:

У губерніях:	1897 г.	1907 г.	Прырост:
Віленскай . .	1.197.309	1.313.102	115.793 = 9,7%
Ковенскай . .	1.099.069	1.167.134	68.065 = 6,2%
Гродзенскай.	1.162.379	1.210.255	47.876 = 4,2%
Мінскай . . .	1.641.080	німа пэўных данных.	
Вітэбскай . .	1.164.444	1.208.120	43.676 = 3,8%
Магілёўскай.	1.351.533	1.514.765	162.232 = 12 1%

Агульны прырост жыхараў Краю за 10 гадоў:

У губэрнях:	Паводлуг спісу 1897 г.	Паводлуг данных на 1.I. 1907 г.	Прырост:
Віленскай . .	1.591.207	1.842.246	251.039 = 15 8%
Ковенскай . .	1.544.564	1.707.558	162.994 = 10,5%
Гродзенскай.	1 603.409	1.734.695	131.286 = 8,2%
Мінскай . .	2.147 621	2.621.214	473 673 = 22,9%
Вітэбскай . .	1.489.246	1.674.719	185.475 = 12.4%
Магілёўскай.	1.686.764	2.069.419	482.655 = 28,6%

С першых дзьвёх табліц мы бачым, што прырост сельскага насяленьня ва ўсіх шасьці беларуска-літоўскіх і беларускіх губэрніях шмат адстае ад прыросту агульнага числа жыхараў. Гэтак у Віленшчыне адпаведные цыфры будуць 9,7% і 15,8%, у Ковеншчыне—6,2% і 10,5%, у Гродзеншчыне—4,2% і 8,2%, у Вітэбшчыне—3,7% і 12,4%, у Магілёўшчыне—12,1% і 28,6% *).

Што ў местох чысло жыхараў усюды узрастае шыбчэй, чым па вёсках, гэта вядома кожнаму. Але, затрымаўшыся на значнай розьніцы у гэтым адставаньні вёскі ад места ў розных губэрнях нашага Краю, мы можэм пабіць апошніе на дзьве групы: ў аднэй адносіны між цыфрамі абедзьвых катэгорый вышэй 1 : 2 (Віленская, Ковенская, Гродзенская), ў другой — ніжэй (рэшта губэрній). Скуль гэткая розьніца?

Каб вытлумачыць яе, трэба зьвярнуцца да агульных варункаў жыцьця нашага Краю. І тут перш за ўсё нам кінецца ў вочы факт, што тры першые губэрні больш культурны за тры другіе: ужо ў 1897 гаду ў іх граматных было:

	мужчын:	жанок:
Віленская .	34,8%	23%
Ковенская .	42,8%	41.4%
Гродзенская	38,4%	19,6%

У трох другіх:

	мужчын:	жанок:
Мінская . .	25,4%	10,1%
Вітэбская .	29,9%	19,5%
Магілёўская	25,8%	8,4%

Поруч с тым можэм адзначыць, што тры губэрні першай групы могуць пахваліцца і вышэйшым развіцьцем сельскай гаспадаркі: не прыводзячы статыстычных данных, скажэм толькі вядомы ўсім факт, што гэтые губэрні найбольш энэргічна зьменялі старую сыстэму гаспадаркі на хутарную, што тут найбольш ідзе ў ход сельскагаспадарскіх машын, штучных гнаёў і т. п.

Урэшці, спаміж першых трох губэрняў Ковенская—ўся каталіцкая, а і дзьве другіе маюць даволі многа каталіцкага насяленьня, каторае, як вядома, было пад Расеей заўсёды агранічэно у правох. Агранічэньне гэтае найбольш ярка выяўлялося да апошніх гадоў у забароне куплі зямлі беларусам і літвіном каталіцкае веры, залічэным маскалямі да „палякоў“. Гэтая забарона, само сабой, не магла мець больш прыкметных пасьледзтв у губэрнях з абсалютна перэважываючым праваслаўны і насяленьнем—Мінскай, Вітэбскай, Магілёўскай

Ужо апошняя прычына (не кажучы аб бліжэйшым суседзтві з Заходам) павінна была пакіраваць у губэрнях першай групы разьвязку зямельнага пытаньня на іншую дарогу, чым у другой групе. Гэта пацьверждаюць цыфры.

Паводлуг данных цэнтральнага статыстычнага камітэту на 1905 год куплено селянамі зямлі:

У губэрнях:	Дзесяцін:	%% да абшару надзельнай зямлі.
Віленскай . .	184.413	14.4%
Ковенскай .	189.803	11.8%
Гродзенскай	248.160	16.5%
Мінскай . . .	484.219	24.9%
Вітэбскай . .	359.457	22.6%
Магілёўскай	625.888	40.3%

Цыфры гэтые кажуць, што Віленшчына, Ковеншчына і Гродзеншчына прымушэны былі шукаць разьвязкі зямельнага пытаньня на грунці вышэйшага развіцьця сельскае гаспадаркі, інтэнсыфікацыі яе,—пад той час, як Міншчына, Вітэбшчына і Магілёўшчына ратунак для сябе бачылі ў больш даступным для праваслаўных селян пашырэньні абшару гаспадарств. Цікава адзначыць, што ў Магілёўшчыне — найбольш *неграматнай* з усіх губэрняў краю, з найбольш прымітыўнай селянскай гаспадаркай,—абшар купленай селянамі зямлі становіць 40% абшару надзельнай, а ў найбольш *граматнай* Ковенскай—толькі 11,8%, значыць, менш, чым у кожнай іншай.

Інтэнсыфікацыя селянскай гаспадаркі—гэта і ёсьць тая прычына, каторая ў Віленшчыне, Ковеншчыне і Гродзеншчыне вызывае больш раўнамерны прырост насяленьня ў вёсках і местох: бо яна трэбуе больш рабочых рук, дае заработак большаму числу людзей, дае больш спажыўных прадуктаў і больш народу можэ пракарміць.

Г. Б.

*) Разная нераўнамернасьць узросту агульнага числа жыхараў па губэрнях тлумачыцца, трэба думаць, у значнай меры сільнейшай эміграцыей у Амэрыку, Сібір, Туркестан і т. д.

Большэвіцкая Расея.

(Гл. «Гоман» № 49).

А як „голад не дзядзіна—з'ясі і крадзена“, то людзі, ня меўшые хлеба ад „продупраў“ (емінных упраў), мусілі і мусяць даставаць другой дарогай, і цяпер усю Большэвізію кормяць „мешканошы“ Калі даводзілося вам сесьці ў чыгунку з Варонежа ці с Курска, ці недаўна з Лазавой або і Харкава, то вы не маглі не зьвярнуць увагі на множства людзей, мужчын і жонак. Кожны валачэ мех альбо з жытам, альбо з мукой. Нехай пад'едзе поезд пад станцыю, як уся гэта жывая паводка кідаецца ў вагоны праз дзьверы, праз вокны, заўсёды выбітые, а то і выламаные з рам; выбіваюць вокны ў вагонах, калі яны яшчэ якім цудам ня выбіты, і разьмешчаюцца ў вагоне. Хто не папаў у вагон, лезе на страху. Калі ў вас дужые рукі і ногі і асабліва рэбры, то пралезеце ў вагон і вы, і вашым воччу прэдстаўляецца гэтакі абраз: на паліцах, на лавах, пад лавамі, адным словам, усюды на першым месцы, як найважнейшые асобы, стаяць мяхі з збожжэм і мукой. Мяхі—гэта першая асоба, чэлавек пры іх толькі „з боку прыпёку“. Мешканошы не знаюць розьніцы ў класах вагонаў. Падыйшоў першы клас, то першы, трэці—то трэці. А як апошнюю зіму і вясну Расея пражыла пад знакам дэмобілізацыі войск і ўсе вагоны былі забіты салдатамі, ехаўшымі ўсюды без білетаў, то і ў мешканошаў з'яўляецца свой „зашчытны“ мундзер—салдацкая шынэль. Пратоўкшыся ў вагон, завядзеце гутарку з мешканошамі. Тут едзе каля вас стары работнік з якога небудзь Іванова-Вазьнесенска, ці з другога фабрычнага стрыжня (цэнтру) верхняга Узволжа. Ен вам раскажэ, як яны апошні вагон збожжа дасталі ў лістападзе месяцы, што сын яго забіты на вайне і ён астаўся з унукамі, што бяз хлеба жыць далей нельга і вось ён кожны месяц езьдзіць у Варонеж, Курск і Елецк і прывозіць тры-чатыры пуды жыта. Побач з ім сядзіць другі работнік, паказывае пасьведчэньне ад фабрычнага работніцкага камітэту, што ён едзе купіць мех пшоннай мукі для такой і такой земскай бальніцы. Далей едзе баба-салдатка, каторую выслаў сход яе вёскі

Францішак Олехновіч.

На Антокалі.

П'еса ў 3 актах са сьпевамі і танцамі.

(Гл. „Гоман“ № 49).

МАЦЕІХА.

А!.. У злучэных штатах!.. вось як! Дык там дзікіх людзей і напп німа?

ІГНАТ.

Німа.

МАЦЕІХА.

Дякуй Богу, а то маглі б разграбіць усё тое, што асталося па нябошчыку.

МІХАЛІНА.

(напоўніўшы чаркі, каторые Зоська прынесла с кухні).

Ну, хадзеце сюды, трэба выпіць па чары!.

ВІНЦЭНТ.

Добра кажэш, Міхця!

АНУФРЫ.

Ну, калі піць, дык піць!.. (бярэ чарку) За вашэ здароўе, пан Ігнат!.. А вы з намі ня вып'еце?

ІГНАТ.

Ніколі ня п'ю.

ВІНЦЭНТ.

А я табе кажу: пі, не пашкодзіць!

ІГНАТ.

Дык сягоньня мо' і варта выпіць...

АНУФРЫ.

Вось добра!..

МАЦЕІХА.

А мне дык выбачайце... Мне ўжо трэба йсьці ў сваю краму. Я там пакінула толькі адну маю Эльжусю, яна нэ дасьць сабе рады.

МІХАЛІНА.

Ды пачэкай! не гарыць! Вы ня ведаеце яшчэ, што ў нас сягоньня два сьвяты.

МАЦЕІХА.

Якое-ж другое?

МІХАЛІНА (с трыумфам).

Пан Ігнат заручыўся з нашай Зосяй.

МАЦЕІХА.

Што вы кажэце?! А мае-ж даражэнькіе! Вось радасьць! Самые неспадзеўкі сягоньня. Зосенька!.. хадзі, дзіцятка, хадзі, галубка, пацалую цябе... (цалуе Зоську).

АНУФРЫ.

Ого-го, панок! Віншую, віншую! Вось дык так, значыцца! Доля людзкая бытцым кола, як той казаў. Хто сёньня на версі, заўтра у нізе і на адварот... Вось як! Праўду кажучы, вы, панок, маеце нешта трохі і сваіх сабраных грошы.

ВІНЦЭНТ.

Німа дзіва: ня п'е, у карты не гуляе (яшчэ нешта шапочэ на вуха Ануфраму), дык і сабралося.

АНУФРЫ.

А ведаеце што, панство? Маю пекную целяцінку. Не целяціна, — а марцыпан! Мо' прыслаць вам едзін задок, пані Вінцэнтова?

МІХАЛІНА.

Сама ня ведаю... А ну, прышлеце, калі на павер...

АНУФРЫ.

Ведама! магу вам скрэдытаваць хоць на 100 рублёў.

МАЦЕІХА.

А я ўсіх перэпрашаю і пабягу ўжо, бо не маю часу... Бывайце здаровенькі! (Да Зоські): Хадзі, яшчэ раз цябе пацалую, мая галубка! (цалуе Зоську). Ну, і бывайце ўсе здаровы! (выходзіць).

З'ява 17.

ТЫЕ-Ж без МАЦЕІХІ.

АНУФРЫ.

Ну, цяпер, як пайшла Мацеіха, ўвесь Антокаль будзе хутка ўсё ведаць. Вам мо' здаецца, што яна так сьпешаецца да сваей крамы? Ды не! Яна паляцела, каб хутчэй расказаць усім кумам, што тутака чула. Гэта ўжо такая хвароба — язык сьвярбіць.

З'ява 18.

ТЫЕ-Ж і АРОН.

АРОН (уходзіць).

Дзень добры панству! Смачнага апэтыту панству! Ці не перэшкаджаю?

МІХАЛІНА.

Просім! просім! Як маецеся, пан Арон?

АРОН.

Дзякую, пані Вінцэнтова, добра. Я толькі на адзін момэнт. Я маю інтэрас да пана Ігната.

ІГНАТ (зьдзівіўшыся).

Да мяне? інтэрас? Ну дык слухаю.

АРОН.

Вельмі важны інтэрас. Кароткі і важны інтэрас. (Усе сідзяць у глыбі сцэны, п'юць і закусываюць. Арон з Ігнатам на першым пляне).

Седайце, панок!

ІГНАТ (седае).

па жыта. Едуць і бойкіе салдаты, каторые прызнаюцца, што гэтак яны цягаюцца ад Палтавы да Масквы, возючы муку такому й такому пасрэдніку. На тварах усіх відаць трывогу, бо, і праўда, раптам ні с таго, ні с сяго машына зараз за станцыей зварачывае на якую небудзь бакавую галінку, у вагон уваліваецца чырвоная армія і адбірае муку і збожжэ. І тут бывае альбо поўная анэксія збожжа і мукі, альбо мір без анэксый, але з невялікай кантрыбуцыей, так па рублю, па два ад пуда, з асьцеражэньнем, што гэта контрыбуцыя збаўляе ад анэксіі толькі да найбліжэйшай контрольнай станцыі, а там свая аўтаномія, свае парадкі, свая контрыбуцыя. Але часам бывае, што „таварышы“ мешканошы не здаюцца так скора, як „таварышы“ ў акопах: вагоны шчыльна зачыняюцца, і процію стрэльбаў чырвонаармейцаў з вакон высовываюцца дзесяткі руляк стрэльбаў і леварвэраў. Можна сьмела сказаць, што палавіна мешканошаў мае пры сябе аружжэ. Папаўшы у вёску масамі, пяхотные стрэльбы абрэзываюцца з абодвых канцоў, каб зрабілася стрэльбачка, каторую можна схаваць пад палой. Трэба сказаць, што у такім спатканьні з аружжэм у руках часта перэмагаюць мешканошы. А як да гэтага і чыгуньнікам нема ахвоты дастаць у чужой сварцы, то яны ўсімі сіламі стараюцца ўцячы разам с паравозам і поездам з месца біткі. Але бывае, што з боку чырвонай арміі засакочуць кулямёты, і пасьля гэтага з вагонаў цягаюць ня толькі мяхі з мукой, але і акрываўленых людзей. Усё ж такі справа найчасьцей канчаецца мірам без анэксій, але с контрыбуцыямі.

Разглядзём падваліны мешканоства. Селянін Варонескай ці Курскай губ. мае збожжэ. Казённая цэна за яго ў сімінных управах нешта 9 р. Да яго прыходзіць мешканош, дае яму і 18, і 20, і больш рублёў. вязе гэта збожжэ ў Маскву, дзе можэ прадаць яго па 200—250 р. Бярэ ён зараз пуды 3-4, траціць на дарогу і ўсё дзён 4 5, заробак яго выходзіць каля 200 р. на пудзе, а на 4 пуды каля 800 руб. за 5 дзён, інача̂й кажучы, 160 руб. у дзень. Ясна, што дзеля гэткага заробку варта таўпсьціся колькі дзён у дарозе і што заробак астаецца вялікім нават тады, калі палавіна па дарозе пападзе пад анэксію. У якіх размерах вядзецца мешканоства, відаць з асобных прыкладаў. Напрыклад, Масква ў красавіку месяцы тры чверці (3/4) патрэбнага збожжа дастала ад мешканошаў. У тым-жэ часе збожавые Лівенскі і Елецкі паветы вывозілі праз мешканошаў па 40 тысяч пудоў збожжа ў дзень. А як на кожные 4 пуды збожжа выпадае 1 чэл., то выходзіць, што, каб правезьці гэтые 40 тысяч пудоў збожжа, трэба было правясьці чэлавечыны, лічучы па 4 пуды чэл., 10 тысяч пудоў у адзін бок і 10 тысяч пудоў у другі бок, разам 20 тысяч пудоў. І усё гэта дзеля таго, што свабодная прадажа збожжа была скасавана, а большэвіцкі ўрадовы апарат даставіць збожжа не патрапіў.

«Сабатажнік».

(Далей будзе).

У Вільні і ваколіцах.

× **Купальле.** У гэту нядзелю, 23 чэрвеня, прыпадае сьвята Купалы.

Гэты перажытак старасьвеччыны захоўваецца ад вякоў па ўсей Беларусі. І ў сталічным месьці нашага краю, Вільні, з году ў год беларускае грамадзянства ладзіло сьвяткаваньне Купалы, каторае складалося с паездкі па Вільлі на пекна прыбраных параходах, плытох і лодках, с пусканьня вянкоў па вадзе, ды ўсё гэта пад песьні хору беларускага, з музыкай, штучнымі агнямі. Карагод параходаў, плытоў і лодак даходзіў ажно да Закрэту, дзе адбывалася забава да самае раніцы с традыцыйнымі вогнішчамі, скіканьнем праз вагонь, песьнямі, танцамі і т. п. А ў той жэ час зьежджаючыеся на гэты дзень з розных канцоў краю беларускіе дзеячы адбывалі свае нарады аб сваей рабоці, намечалі пляны далейшае працы, судзілі аб будучыні...

Вайна прыпыніла сьвяткаваньтрадыцыйнага сьвята. І толькі хіба пасьля канца яе ізноў у гэту ночку загарацца Купальскіе агні.

× **Выстаўка Вільня — Менск.** Выстаўка гэта, як абраз мейсцовай беларускай культуры, прыцягівае даволі многа публікі. Для нямецкай публікі, каторая, на жаль, зусім не знаёміцца сваей прэссай з беларусамі і іх культурай, гэта—цэлае адкрыцьце.

Выстаўка мае трываць да канца месяца, а пасьля яе маняцца перавесьці ў Менск.

Выстаўка памешчаецца на сьв. Юрскім праспэкці № 35 і адчынена кожын дзень ад 10 ад 8 гадз.

× **У Беларускім Камітэці.** Камітэт атрымаў гэткіе ахвяры: ад п. В. Іваноўскага—40 руб. (рас.), ад п. Сарочкіна — 12 м., за што высказывае сваю шчырую падзяку.

× **Доступ у школы Нямеччыны.** Па загаду прускага міністэрства культу дзецям расейскіх падданых адкрыт ізноў доступ у школы ў Нямеччыне

× **„Рэвізор“ на намецку.** 19 чэрвеня ў нямецкім тэатры ігралі несьмяртэльны твор Гоголя „Рэвізор“.

× **Аб грошы у зьберэгацельных касах.** Цяпер прэдстаўнікі нямецкага ўраду вядуць перэгаворы з расейскім урадам аб выплаце Расеей сум, паложэных у розных часах у расейскіе зьберэгацельные касы. Нямецкіе паўнамочнікі стараюцца дайсьці угоды, паводлуг которай гэтае пытаньне былобы разьвязано роўна і для ўсяго абшару Об. Ост.

× **Аб прадажы скаціны.** Начальнік упраўленьня Літвы напамінае аб істнуючых агранічэньнях пераходу жывёлы з рук у рукі. Ня толькі прадаваць, але і аддаваць у арэнду скаціну больш, чым на 2 тыдні, можна толькі маючы пазваленьне ад сваёго крэйсгаўптмана. За нарушэньне гэтых правіл карацімуць штрафам да 6.000 м. і вастрогам да 6 месяцаў. Апрыч таго скаціну будуць конфіскаваць.

× Тэмпэратура. Найвышэйшая і найніжэйшая тэмпэратура за апошніе дні была (па Цэльсію):

	найвыш	найніж.
1 —18	+ 15,7°	+ 8,6°
18 -19	+ 31,5°	+ 7,7°
19—20	+ 22,0°	+11,2°

БІБЛІОГРАФІЯ.

„Базылішк. Казка ў 3 актах Францішка Олехновіча. Вільня. 1918.

Да беларускай тэатральнай літэратуры прыбывае яшчэ адна друкаваная рэч. „Базылішк“ быў, праўда, друкаваны ў „Гомане“, але доля газэтных фэльетонаў—быць забытымі разам с прачытаным нумэрам. І „Базылішк“ у асобнай кніжцэ мае зусім іншую вагу.

Ф. Олехновіч ужо добра вядомы беларускаму грамадзянству ня толькі як выдатная сцэнічная сіла і рэжысэр беларускага тэатру, але і як драматычны аўтар. Мы бачылі на беларускай сцэне ў Вільні яго „Калісь“, „Бутрыма Няміру“, „Маньку“, „На Антокалі“, “На вёсцы“, „У лясным гушчары“ — толькі „Базылішка“ ў нас яшчэ не ігралі. І калі аб вышэй памянутых творах п. Олехновіча мы маглі судзіць паводлуг іх выставы, што вельмі аблегчае задачу крытыкі, дык ацэнка „Базылішка“ толькі паводлуг тэксту — шмат труднейша.

Як бачым с самага тытулу, „Базылішк“—гэта апрацованая для сцэны народная казка-легэнда аб страшаку, які некалі—у старабытные часы—быў пасяліўся ля варот Вільні і, падпілноўваючы падарожных, адным поглядам вачэй сваіх забіваў іх, а пасьля высмактываў з іх усю кроў. Вялікі перапуд агарнуў усіх жыхараў сталічнага места Віленскага. Многа вояў адважных прабавало мячом вызваліць свой родны горад ад базылішка,—але супроць погляду яго страшных вачэй іх адвага і зброя былі бязсільны. Дні ішлі за днямі, і страх і роспач агарталі народ усё болей: ні ўвайсьці ў Вільню, ні выйсьці з яе ня мог ніводзін жывы чэлавек. А на грунці агульнага перапуду выраслі самые дзікіе і шалёные думкі і праекты. „Базылішку трэ даць ахвяру!“—пачалі казаць усе ў вадзін голас. І ахвяру не абы-якую: трэ даць самую лепшую, самую чыстую, самую харошую істоту—князеўну. Народ зьбіраецца ля княжых харомаў і трэбуе гэтай ахвяры. А воі і баяры, разумеючы, што іх сіла і адвага—дарэмны, моўчкі ждуць згоды старога сваёго валадара—князя. Даведаўшыся аб гэтым, князеўна, горача любіўшая свой народ, гатова аддаць за яго вызваленьне сваё жыцьцё. Але тут выступае на сцэну новая асоба. Гэта—Янка, малады паэта, каторы жыве адно сваімі думкамі-песьнямі, здалёк ад рэальнай будзеншчыны, і людзі завуць яго „дурны Янка“. Янка хавае ў сэрцы сваім вялікую тайну: ён любіць князеўну, ды ня сьмее падняць проста вачэй на яе, а туляецца ля сьцен замку, каб здалёк, украд-

АРОН (седае).

Я так сама сяду сабе... Вы, панок, разумны чэлавек!..

ІГНАТ.

Гм... Ня ведаю...

АРОН.

У разумнага чэлавека грош расьце, як грыб, як трава, а дурному ўсё роўна што нож у руку... А цяпер аб інтарэсе! — ці вы, панок, ведаеце, што гэта — музыка?

ІГНАТ (зьдзіві́ўшыся).

Музыка?

АРОН.

Але,—музыка!—Музыка гэта такая штука, што робіць так прыемна на сэрцы, быццым хтосьці сто рублёў табе даў! Кожная штука — і тая, што пэндзлям робіцца, і тая, што ў тэатры прэдстаўляюць, — гэта штука, але самая прыемная штука— гэта, ух! музыка.

ІГНАТ.

Але, музыка—рэч прыемная.. А вы мелі аб якімсь інтарэсе...

АРОН

Але!... Вы самі кажэце, што гэта прыемная рэч... Калі чэлавеку сумна, а зайграе такая музыка, тады ўраз робіцца на сэрцы вясёла, а калі табе вясёла, а зайграе такая музыка, тады ўраз-жэ робіцца сумна.

ІГНАТ.

Вы, пан Арон, мусіць надта любіце музыку... Калі-ж аб інтарэсе?

АРОН.

Інтарэс?... Гэта і ёсць інтарэс! Гэта добры інтраэс! Гэта брылянтовы інтарэс!

ВІНЦЭНТ.

Ды што вы там аб інтэрэсах! Кіньце гэтые інтэрэсы! Хадзеце лепш да нас на чарачку.

АРОН.

Ўраз, ураз, пане дабрадзею, дзякую... Тутака вельмі важная рэч... (Да Ігната): Праўда, што вы любіце музыку?

ІГНАТ.

Вось, так сабе...

АРОН,

Падумайце толькі, панок, якая гэта прыемная рэч: накруцілі, ўсадзілі іголку—і іграе!

ІГНАТ (не разумеючы).

Што йграе?

АРОН

Ўсё йграе! што хочэце — то і ігр е! Якіе ноты купіце, такіе, і ігр е!

ІГНАТ

(далей нічога не р зумее).

АРОН.

Пан Ігнат! Вы павінны купіць у мяне грамафон.

ІГНАТ.

Ды... на што?...

АРОН (перэпыняючы).

Пачэкай пан! — Найнавейшай фірмы... танна!—Усадзіце іголку і іграе...

ІГНАТ

Ды не...

АРОН (я. в.)

Пачэкай панок!— Так купі пан патэфон, —тады ня трэба ўжо ўстаўляць іголку, бо там сядзіць ужо такій камень, што ня трэба іголкі.

ІГНАТ.

Э... падумаю яшчэ...

АРОН.

На што думаць! Фэ! Ня трэба думаць! Хай толькі панок думае, якая гэта прыемная рэч — меці такую машыну. Вам тады німа ніякай патрэбы хадзіць у тэатр, бо вы маеце ўсё ў сваей хаці, а мо' і ляпей яшчэ! Бо якая-ж гэта прыемнасьць у тэатры? Заплацілі вы грошы, сядзець вам невыгодна, і яшчэ за свае грошы трэба глядзець, як акторы мучацца Ці-ж вы думаеце, што ім прыемна? Гэта іхні інтарэс, яны павінны гэта рабіць, бо ім за гэта плацяць, але тут німа ніякай прыемнасьці Ці-ж вам прыемна глядзець, як людзі мучацца? Фэ! фэ! Вы не маеце сэрца

ІГНАТ.

А колькі-ж гэта каштуе?

АРОН.

Маю на розные цэны... Для вас маю — ух! — голас чысты, як чэлавек пасьля цяпліцы. — Машына і дзесяць „пласьцінак“—сорак рублёў.

ІГНАТ.

Ооо!...

АРОН

Што: осо?!.. і дзесяць «пласьцінак»! Дасьцё мне цяпер 5 рублёў і будзеце мець грамафон, а рэшта на выплату!

ІГНАТ.

Сам ня ведаю...

АРОН.

Што: сам ня ведаю! — Такі багаты пан — і «сам ня ведаю»!

(Далей будзе).

кам яе ўбачыць. Вось гэты „дурны“ Янка, пачуўшы страшную для яго весьць, ня хочэ дапусьціць да спаўненьня крывавай ахвяры. Лепей аддаць сваё ўласнае жыцьцё за жыцьцё князеўны, за вызваленьне роднага места ад базылішка! Янка бяжыць да замку і кажэ, што ён знайшоў спосаб забіць базылішка: хай толькі дадуць яму люстэрка і хустачку князеўны. Усе зьдзіўлены гэтым, — суляць яму хто меч, хто рагатыну. Князь абяцуе вялікую награду. „Ня трэба мне награды!“—адказвае Янка. Жывы—ён нічога ня просіць; затое просіць награду, калі згіне. У гэтым выяўляецца ўся яго паэтычная душа: „Як згіну я, ды знойдзеце мой труп, то закапайце яго ў зямлю з гэтай хустачкай на грудзях... Насыпце нада мной курган... А ты, князеўна, калі на цябе надойдзе сум — такі, што аж сьлёзы пасыплюцца з вачэй, сходзі на той курган,—і можэ хоць адна сьлязінка прыпадкам капнець на пясок, прасочыцца скрозь зямлю і ўпадзе на мае грудзі... Прыцісну хустачку — памятку тваю мацней да сэрца і буду цешыцца ў дамавіне, што гэта ціхая сьлязінка з вачэй тваіх сарвалася мо' з жалю па мне... І вось уся награда ля мяне!!!..“ Янка пайшоў і забіў базылішка,—ці, лепей, той сам сябе забіў, убычыўшы ў люстэрку Янкі адбіцьце смяротнага пагляду сваіх вачэй. А князь стары, разгадаўшы тайну сэрца Янкі, дае яму ў награду дачку сваю за жонку.

Гэта казка-легенда, перэказаная п. Олехновічэм у форме драматычнага твору, захавала ўсю сьвежасьць і паэзыю народнай творчасьці. І ў гэтым выявіўся артыстычны смак аўтара і почуцьцё характва. А постаці, выступаючые на сцэне, поўны жыцьця і захоўваюць той характэр старасьвеччыны, якім абвеяны ўсе постаці народных казак і легенд. Будзем спадзевацца, што і гэты новы твор п. Олехновіча сустрэне гарачы прыём нашага грамадзянства, калі будзе пастаўлен у восенным сэзоне на сцэне беларускага тэатру.

А. Н.

З усяго Краю.

ШАСТАКІ, Віленскага пав. У нядзелю, 16 чэрвеня, тут адбылася беларуская вечарынка с тэатральным аддзелам, пеяньнем, дэклямацыей і танцамі. Ігралі п'есу Ф. Олехновіча „На вёсцы“. Народу было многа. Акуратную справаздачу дамо ў чародным нумэры.

ГОРАДНЯ. 20-гадовы дзяцюк намовіў двох 10-гадовых хлопчыкаў залезьці ў архірэйскі дом і выкрасьць для яго адтуль дакумэнты, каторые ён маніўся пасьля прадаць на паперу. Калі яго арэштавалі і павялі, ён кінуўся ўцякаць і быў падстрэлен. Яго паслалі ў лазарэт. С прычыны таго, што дакумэнты ў архірэйскім доме маюць вялікую вагу, спробу зьнішчыць іх, як старую паперу, трэба востра асудзіць.

ГОРАДНЯ. Жыдоўская драматычная дружына з Лодзі цяпер выступае на гараднянскай сцэне. Спэктаклі праходзяць пры перапоўненай салі.

АЗЕРЫ. Нямецкі унтэрафіцэр Кэкэ быў знойдзен забітым і абрабаваным 6 чэрвеня. Ужо 8 чэрвеня арэштавалі Владыслава Лабачэўскага, 18 гадоў. Калі трэсьлі ў яго ў хаці, знайшлі ў яго грошы і рэчы забітага Кэкэ. С прычыны бясспорных улік Лабачэўскі прызнаўся, што ад 1915 году ў яго была расейская пяхотная вінтоўка, каторай, ня гледзячы на чысьленые загады, ён не здаў. 5 чэрвеня Лабачэўскі пайшоў на паляваньне на качэк, ды на гэтым яго злавіў Кэкэ. У адказ на крык, каб аддаў стрэльбу, ён стрэліў у Кэкэ 4 разы. Першая куля папала Кэкэ ў трыбух, другі патрон даў асечку, трэйцяя куля прайшла міма, а чацьвёртая папала Кэкэ ў галаву і забіла на месцы. 15 чэрвеня палявы суд у Горадні засудзіў Лабачэўскага на сьмерць. 16 чэрвеня ён быў расстрэлян. Перад сьмерцю ён спаведаўся і прыняў камунію ў праваслаўнага сьвяшчэніка.

ІНДУРА. За контрабандны падвоз емінных прадуктаў купец Давід Марголіс засуджэн на 500 м. штрафу і 100 дзён вастогу.

ДЗЬВІНСК. За нашэньне аружжа і спробу рабунку Іван Вонок засуджэн палявым судом на сьмерць і расстрэлян.

ДЗЬВІНСК. Тут арганізован пасрэдніцкі суд між дамаўласьнікамі і кватэрантамі.

КОУНА. Пад стрэхай крэпаснога лазарэту знайшлі труп майстра гадзіннікаў, Константына Салтэніса. Сьмерць здарылася ад стрэлу ў галаву. Паводлуг досьледаў, труп перанесьлі туды некалькі асоб. Салтэніс заўсёды меў с сабой вялікіые грошы, гуляў у карты і часта бываў у кумпаніі падазрыцельных асоб. Думаюць, што яго кумпаны забілі і абрабавалі яго, а труп занесьлі пад стрэху. Арэштованы некалькі асоб.

РЫГА. Чысло запісаўшыхся ў політэхніку студэнтаў дайшло ўжо 500 і с кожным днём павялічываецца.

ВЕСТКІ З РАСЕІ.

БЭРЛІН. Паводлуг дайшоўшых вестак, у заходнім Сібіры чэхословакі і контррэвалюцыянэры скінулі большэвіцкую ўласьць. Чэхі занялі Омск. Каля Омска, Кацярынбурга і Уфы ўзьняліся крывавые бітвы. Новы ўрад пастанавіў сазваць установчы сэйм. Проці гэтага ўраду Ленін выпусьціў праклямацыю да работнікаў, віноваючы французаў у паддзержцы чэхаў. Прызваны ў армію запасные наборы 1893—1897 гадоў. У Самары чэхамі камандуе францускі палкоўнік Сэліт'е.

«Ізвестія» пішуць:

«Тое, што Францыя і Англія ўмешаліся ў нашы ўнутрэные справы, раўназначно поўнаму нашаму разрыву з нашымі быўшымі саюзьнікамі».

МАСКВА (В.Т.Б.). Чычэрын апавесьціў саюзьнікам нотаю, што дзеля затушэньня паўстаньня чэхаў учынены самые энэргічные крокі. Опэрацыі запягнуцца с тае прычыны, што савецкі ўрад хочэ разьбіць да званьня гэту апошнюю спробу контррэвалюцыянераў.

ЦЮРЫХ (В.Т.Б.). С прычыны ладжэньня расейскае арміі гэнэрал Брусілов заявіў, што пры цяперашнім палажэньні гутарка можэ ісьці толькі аб арміі дабравольцаў. Пры цяперашніх палітычных варунках агульная ваенная павіннасьць немагчыма. У ладжэнай арміі павінен быць выключэн прынцып выбараў начальнікаў і ваенных камітэтаў. Вядома, аб баевой здольнасьці ладжэнай арміі яшчэ доўга ня можэ быць гутаркі. Акуратная ваенная муштроўка немінуча.

З усяго сьвету.

ЖЭНЕВА. Клемансо прэдлажыў кіраўніком соцыялістычнае партыі месцы ў сваім міністэрстве. Аднак, соцыялісты заявілі, што пры цяперашніх варунках яны адмаўляюцца ад учасьця ў урадзе.

СОФІЯ (В.Т.Б.). Міністэр-прэзыдэнт Радославоў выйшаў у адстаўку с прычыны нязгодлівасьці з двома сваімі памочнікамі, членамі партыі стамбулістаў. На яго месцо будзе назначэн галава дэмакратаў, Александар Малінов, у часе міністэрства каторага ў 1911 гаду князьства Боўгарыя аб'яўлено за царства.

БУКАРЭШТ. Кароль адкрыў нова-выбраны парлямэнт прамовай, успамінаючы аб нешчасьлівай вайне, зрабіўшай старонцы пяжкіе раны, каторые трэба залячыць. Прылучэньне Бессарабіі да роднай ёй Румыніі—гэта вялізарная радасьць, якая закрывае сабой перажытые мукі. У гасударственым ладзе трэба зрабіць вялікіе перамены. Главная задача—гэта аграрная рэформа і допушчэньне ніжэйшых клясаў да палітычнага жыцьця.

Пры адкрыцьці парлямэнту, пры чытаньні тронные прамовы і пры закрыцьці заседаньня дэпутаты віталі караля крыкамі.

ТЭЛЕГРАМЫ.

Нямецкіе апавешчэньні.

18.VI. Заходні тэатр.

Фронт Рупрэхта Баварскага: Варожая артылерыя ажывілася ў Фляндрыі, наабапал Ліс, між Арра і Альбэр. Каля палупачы ворагі атакавалі пры Альбэр, але былі адкінуты і утрацілі палонных.

Фронт нямецкага Насьледніка: На палудзенным заходзі ад Нуайон і на поўдні ад Эн артылерыйскі агонь пад вечар быў крапчэйшы. Месцовые наступленьні на поўначы ад Эн і паўночным заходзі ад Шато-Т'ері адбіты.

19.VI. Заходні тэатр:

Фронт Рупрэхта Баварскага: Пяхотные разьведкі. Ля лесу Н'еп і і пры Бют і Эн адбіты разведачные наступленьні ворагаў.

Фронт нямецкага Насьледніка: Пры Дом'е адбіто францускае наступленьне. Пры Монгобэр пад напорам ворагаў наша лінія крыху адціснена у глыб лесу. На адрэзку Кліньён адбіто наступленьне варожых рот. Пад Рэймсам узяты 50 палонных.

Учора зьбіты 23 варожые самалёты і 3 прывязные лятучые шары. Капітан Бэртгольд дайшоў свае 35 ае пабеды.

КАЛЯ ВАЙНЫ.

ВЕНА (В.Т.Б.). 18 VI. **Урадова.** Бітва пад Вэнэцыей трывае далей. Армія Вурма шмат дзе пасунулася ўпярод. Яе палудзеннае крыло ў упорных бітвах дайшло да каналу Россэба. У ваколіцах Монтэльлё мы пашырылі свае здабычы. Наабапал Брэнты ворагі дарэмна вялі контратакі проці нашых пазыцый. Гэтак сама былі дарэмны і англіцкіе штурмы на поўдні ад Асьяго. Чысло палонных узрасло да 30.000, а здабытых гармат- больш за 120. Дабыча мінамётамі, ваенными матэрыаламі і інш. яшчэ не аблічэна.

ВЕНА. 19.VI. **Урадова.** Палудзеннае крыло арміі Борэвіча йдзе ўпярод. Канал Фоссэта пярэйдзен у некалькіх пунктах. У адным месцы ўзяты палонные с самых разнародных часьцей, перамешаных між сабой. Вельмі вострые варожые атакі наабапал чыгункі Одэрза-Трэвізо зломлены с цяжкімі стратамі нашым агнём і ў штыкавой бытве. Дывізыі эрцгерцога Іозэфа прарвалі пры Совільля некалькі італьянскіх ліній. Чысло палонных усё узрастае. Між П'яве і Брэнтай, на палудзенным заходзі ад Ас'яго, ворагі вялі вострые штурмы проці здабытых намі 15-га пазыцый. Ня гледзячы на цяжкіе страты, ворагі нідзе ня мелі ўдачы. На Дассо Альто італьянцы так сама дарэмна штурмавалі.

БЭРЛІН. Аўстрыяцкае наступленьне на італьянскім фронці, незалежне ад сваіх простых задач, мае яшчэ і пабочные: не даць узмацаваць францускі фронт. Італьянскі главнакамандуючый Діяц пэўне ўжо горка шкадуе, што на просьбу Фоша згодзіўся і паслаў ужо 5 корпусаў на заходні фронт. Аўстрыяцкае наступленьне мело ўжо сур'ёзную тактычную ўдачу. Пляны аўстрыяцкае главнае каманды, ня гледзячы на гэта, так добра укрываюцца, што нет ведама, ці яна спыніла наступленьне, ці маніцца далей вясьці яго.

БЭРЛІН. На францускім фронці першы раз удалося устанавіць бытнасьць італьянскіх войск. Палонные кажуць, што ў зацягіваньні вайны вінавато толькі упорства французаў, англічан і амэрыканцаў. Цяпер Італія абярнулася ў нявольніцу Францыі і Англіі.

БЭРН. У Францыі зыйшлі на бераг першые дружыны чырвонаскурных індыян, каторые будуць біцца ў радах амэрыканскіх войск.

БАЗЭЛЬ. Больш за $1^1/_2$ мільёна жыхараў Парыжа павінны пакінуць свае места. Форты Парыжа сьпешна здбудоўваюцца. Ваенные фабрыкі, музэі, банкі і архівы выежджаюць у правінцыю. Некаторые ўрады гэтак сама выежджаюць. Ваенны камітэт абароны Парыжа прасіў урад зрабіць спіс усіх мужчын ад 35 да 58 гадоў.

ПАРЫЖ (Гавас). Генэрал Эпэрэ назначэн замест генэрала Гійом за главнакамандуючага ў Македоніі.

ЛОНДОН (Урадова). Ад 2 да 15 чэрвеня англіцкіе страты дайшлі 115.768 душ, у тым ліку 5.330 афіцэраў.

БЭРЛІН (В.Т.Б.). У поясе блокады ў Сяродземным моры нашы падводные лодкі затапілі 6 параходаў і 4 парусьнікі разам ёмкасьцю 24.000 тонн.

ЛОНДОН. **Урадова.** Адміралцейства наказывае:

Памочны крэйсэр «Patria» затоплен 13.VI. нямецкай падводнай лодкай.

ЛОНДОН. «Daily Mail» пішэ:

Сусьветнае значэньне ваеннага пажару, абхапіўшага Эўропу, адзначываецца у прыказе амэрыканскага ўраду не асьветляць вуліц Н'ю-Іорка с прычыны небаспекі налётаў с паветра. Гэтае места, каторае ў начы асьветлялося гэтак шчодра, як ніводнае іншае места на сьвеці, хоць яно знаходзіцца ў 3.000 англіцкіх міль ад заходняга фронту, прымушэно цяпер па прыкладу Парыжа і Лёндона жыць у начы ў поцемках. Н'ю-Іорк у цемнаце—гэта сымвал таго, што сусьветная вайна дайшла свайго найвышэйшага разьвіцьця.